**ПЫТАННЕ**

Па выніку праверкі ў плацельшчыка выяўлена, што была праведзена атэстацыя працоўных месцаў па ўмовах працы, якая пацвердзіла права работнікаў на пенсію па ўзросце за працу з асаблівымі ўмовамі працы, а таксама абавязкі наймальніка па прафесійным пенсійным страхаванні работнікаў у адпаведнасці з Законам РБ ад 05.01.2008 г. «Аб прафесійным пенсійным страхаванні». Выдадзены загад аб зацвярджэнні вынікаў атэстацыі. Аднак у тэрытарыяльны орган ФСАН па месцы пастаноўкі на ўлік плацельшчыка не прадстаўлены пералік працоўных месцаў з асаблівымі ўмовамі працы для мэт прафесійнага пенсійнага страхавання. Ці мае права органы фонду прымяніць адміністрацыйную адказнасць за непрадстаўленне пераліку

**АДКАЗ**

У адпаведнасці з пунктам 26 Палажэння аб выплаце абавязковых страхавых узносаў, узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне і іншых плацяжоў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 16.01.2009 г.№40, плацельшчык абавязаны прадстаўляць у органы фонду звесткі аб працоўных месцах арганізацыі з асаблівымі ўмовамі працы па форме і ў парадку, устаноўленым праўленнем фонду, на працягу 5 рабочых дзён з дня прыняцця лакальнага нарматыўнага прававога акту аб зацвярджэнні пераліку працоўных месцаў з асаблівымі ўмовамі працы арганізацыі, унясенні змяненняў і дапаўненняў у названы пералік. Такім чынам, калі загад аб зацвярджэнні пераліку працоўных месцаў з асаблівымі ўмовамі працы арганізацыі для мэт прафесійнага пенсійнага страхавання быў выдадзены, а ў органы фонду не прадстаўлены копія загаду і пералік па ўстаноўленай форме на працягу 5 рабочых дзён, тэрытарыяльны орган фонду мае права прымяніць да вінаватай службовай асобы меры адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з артыкулам 24.11 КаАП РБ «непрадстаўленне дакументаў, справаздач і іншых матэрыялаў» у выглядзе штрафу. Санкцыяй гэтага артыкула прадугледжаны штраф да дваццаці базавых велічынь.